**МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

пр. Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск
Тэл./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/р BY86BLBB36040100621571001001
у Дырэкцыі ААТ « Белінвестбанка »
па г. Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X

**МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**

пр. Независимости, 8, 220030, г. Минск
Тел./факс (017) 218 00 90, 327 68 66

Р/с BY86BLBB36040100621571001001
в Дирекции ОАО « Белинвестбанка »
по г. Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X


22.06.2020 № 6-7-2061/7 зп

На № __________ ад ________________

(для інфармавання зацікаўленых)

Аб разглядзе звароту

У Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце разгледжаны Ваш зварот па пытанні ўдакладнення межаў плошчаў г. Мінска ў сувязі з прыняццем рашэння Мінгарвыканкама от 15.05.2020 № 1536 «Об определении в городе Минске мест, запрещенных для проведения пикетирования с целью сбора подписей избирателей по выдвижению кандидатов в Президенты Республики Беларусь», а таксама з прапановай апублікаваць карту з месцамі, дзе забаронены збор подпісаў. Мінгарвыканкам у межах кампетэнцыі паведамляе наступнае.

Рашэнне Мінгарвыканкама от 15.05.2020 № 1536 «Об определении в городе Минске мест, запрещенных для проведения пикетирования с целью сбора подписей избирателей по выдвижению кандидатов в Президенты Республики Беларусь» было распрацавана на падставе часткі адзінаццатай артыкула 61 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь і з улікам нормаў артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь «О массовых мероприятиях в Республике Беларусь».

У адпаведнасці з часткай першай пункта 3 каляндарнага плана арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, зацверджаным Пастановай Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў ад 08.05.2020 № 12, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам неабходна было не пазней за 18.05.2020 вызначыць месцы, забароненыя для правядзення пікетавання з мэтай збору подпісаў выбаршчыкаў па вылучэнні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

Дадзенае рашэнне не ўтрымлівала прынцыпова новых падыходаў да прававога рэгулявання ў гэтай сферы грамадскіх адносін. Сапраўднае

рашэнне ўступіла ў сілу з 21 мая 2020 г. і дзейнічала па 19 чэрвеня 2020 г. уключна.

Інфармуем, што ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам межы тэрытарыяльных аб'ектаў (збудаванняў) рознай функцыянальнай накіраванасці ўсталёўваюцца існуючымі горадабудаўнічымі праектамі дэталёвага планавання агульнагарадскіх тэрыторый.

Такім чынам, тэрыторыі плошчаў праходзяць па межах бліжэйшых вуліц, у першую чаргу тэрыторый, прызначаных для руху транспарту.

У адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц» сапраўдны адказ Вы маеце права абскардзіць у суд ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку.

Намеснік старшыні А.М.Цуран

11 Шэндзік 218-00-57
11 Дземідовіч 218-01-91